№№131—132
(2651—2652)

17 жніўня 2007 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!

Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 206-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 206-68-71.

БЛІЦ-АПЫТАННЕ

Ці возьме ваша партыя ўдзел у парламенцкіх выбарах, калі ўлада:

а) не дапусціць у камісіі прадстаўнікоў дэмакратычнай апазіцыі;
б) не прадаставіць вам магчымасці свабоднага доступу да сродкаў масавай інфармацыі;
в) не ўнясе змен у Выбарчы кодэкс з мэтай адмены датэрміновага галасавання;
г) не забяспечыць падлік галасоў пры поўным гарантаваным кантролі з боку грамадскасці.

Анатоль ЛЯЎКОВІЧ, выконваючы абавязкі старшыні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі:

— Калі ўсе тыя ўмовы, якія вы зараз назвалі, будуць выкананы, то ўлада, якая на сённяшні дзень ёсць у Беларусі, папросту самаліквідуецца. Аднак пакуль існуюць абмежаванні ў праве свабоднага выбару, разлічваць на гэта не даводзіцца.

Што датычыцца ўдзелу нашай партыі ў будучых парламенцкіх выбарах... Гэта ж выбарамі назваць нельга. На сённяшні дзень мы збіраемся ўдзельнічаць не ў выбарах, а ў палітычнай кампаніі пад такой назвай. За апошнія дзесяць год мы прапусцілі толькі адну падобную кампанію — выбары ў мясцовыя саветы. Мэта нашага ўдзелу ў гэтай палітычнай кампаніі заключаецца і ў тым, каб распавесці нашым грамадзянам аб праблемах у галіне свабод, аб недасканаласці выбарчага заканадаўства, аб праблемах незалежных СМІ.

Аднак заўважу, што адказваю на пытанне з пункту гледжання нашай партыі. Як вы ведаеце, Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя з'яўляецца суб'ектам Аб'яднаных дэмакратычных сіл. Калі АДС, напрыклад, прымуць рашэнне аб байкоце кампаніі, то мы вымушаны будзем гэтаму падпарадкавацца.

Анатоль ЛЯБЕДЗЬКА, старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі:

— Я — старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі, а не правіцель Беларусі. Рашэнне аб удзеле альбо няўдзеле партыі ў выбарах будзе прымацца калегіяльна — на палітсавеце ці на з'ездзе партыі. Бо гэта і ёсць дэмакратыя, лепшага на сённяшні дзень не прыдумалі.

Канечне, у мяне можа быць уласнае меркаванне на гэты конт, але я яшчэ раз паўтару: усё будзе вырашацца калегіяльна.

Вінцук ВЯЧОРКА, старшыня Партыі БНФ:

— Рашэнне аб удзеле ці няўдзеле ў так званых выбарах прымаецца загадзя. На сённяшні дзень датычна нашай партыі такое рашэнне прынята: мы возьмем удзел у выбарчай кампаніі 2008 года дзеля таго, каб ператварыць выбарчы фарс у рэальнае волевыяўленне народа. Будзем выкарыстоўваць усе законныя магчымасці, якія прадстаўляюцца ў межах гэтай палітычнай кампаніі для працы з прадстаўнікамі розных сацыяльных груп. Будзем рабіць захады, скіраваныя на прыняцце ўладамі патрабаванняў Еўрапейскага Саюза, скіраваных на развіццё дэмакратыі ў нашай краіне. Таксама будзем расказваць пра патрабаванні Еўрапейскага Саюза выбаршчыкам. З гэтай нагоды будуць выкарыстаны і восеньскія вулічныя акцыі, у прыватнасці, "Еўрапейскі марш".

Станіслаў ШУШКЕВІЧ, старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады:

— Не хочацца марнаваць час на разважанні над кожным з названых вамі пытанняў. За паляпшэнне становішча ў гэтых сферах трэба змагацца. І мы гэта робім. Рашэнне аб удзеле ці няўдзеле ў будучых парламенцкіх выбарах будзе залежаць ад плёну нашай працы па гэтых праблемных накірунках.

Алена ЯСЬКОВА, старшыня Беларускай партыі жанчын "Надзея":

— Усе пытанні, якія вы пералічылі, хутчэй рытарычныя. Зразумела, што пры тым палітычным строі, які ёсць у Беларусі, ніякія з гэтых патрабаванняў выкананы не будуць. Тым не менш маё глыбокае перакананне, што ісці на выбары трэба. Таму партыя "Надзея" ўдзел у будучай кампаніі возьме.

Юрась БЕЛЕНЬКІ, намеснік старшыні Кансерватыўна-Хрысціянскай партыі БНФ:

— Аб чым вы гаворыце? Усе гэтыя падпункты, якія вы пералічылі, можна выкінуць на сметнік. У Беларусі ўжо даўно няма выбараў. А тыя, хто ў іх удзельнічае, дапамагае гэтаму рэжыму легалізавацца. Людзі, якія называюць сябе апазіцыянерамі, зладзілі кампанію "Скажы Лукашэнку "не!". Тым самым яны дапамаглі легалізаваць ягоны трэці тэрмін. А мы ніколі не будзем ні ў чым спрыяць гэтаму рэжыму. Вы ведаеце, у свой час я і мае калегі — Сяргей Папкоў і Зянон Пазьняк — былі дэпутатамі сапраўднага парламента. Там мы змагаліся за Беларусь — за яе мову, культуру. Мы працягваем гэта рабіць і зараз, бо ўсё нацыянальнае сёння руйнуецца... А для таго, каб змагацца за Беларусь, зусім не трэба сядзець у гэтай "палатцы" побач з так званымі дэпутатамі, разумееце?

Апытанне праводзіў Віталь ГАРБУЗАЎ.

ЧУЛІ?

Узбуджана крымінальная справа ў дачыненні да дырэктара «Промстроя»

Кіраўніка будаўнічага трэста "Промстрой", які будаваў жыллёвы комплекс "Радужный" недалёка ад прэзідэнцкай рэзідэнцыі "Дразды", падазраюць ва злоўжыванні службовым становішчам.

Па афіцыйнай інфармацыі, Уладзімір Мазоўка нібыта парушыў умовы тэндэрнага конкурсу.

"Народная воля" паспрабавала высветліць падрабязнасці тэндэра, які, на думку супрацоўнікаў галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю, прайшоў з парушэннямі, але гэта на працягу ўсяго аўторка аказалася справай няўдзячнай. У самім "Промстрое", пачуўшы пытанне, коратка паведамілі: *"На гэтую тэму мы размаўляць не будзем"*, — і паклалі трубку. Далейшыя спробы датэлефанавацца ў будаўнічы трэст поспеху таксама не прынеслі — тэлефонную трубку ўвогуле не здымалі...

ДЛЯ ДАВЕДКІ

Закрытае акцыянернае таварыства "Промстрой" займаецца будаўніцтвам аб'ектаў вытворчага прызначэння, адміністрацыйных будынкаў, шматпавярховых жылых дамоў, а таксама катэджаў. Намаганнямі "Промстроя" пабудаваны і ўведзены ў эксплуатацыю больш 70 аб'ектаў вытворчага і спецыяльна-бытавога прызначэння. У тым ліку жыллёвы комплекс "Радужный" (малапавярховая забудова ў межах праспекта Пераможцаў — праезда Дразды — ракі Свіслач). Акрамя таго, "Промстрой" адбудаваў жылыя дамы па праспекце Пераможцаў, 57 і вуліцы Сурганава, 88.

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

Хуткага спуску!

Як стала вядома, намеснік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта **Наталля Пяткевіч** абрана старшынёй Асацыяцыі "Беларуская федэрацыя гарналыжнага спорту і сноўборду". Акрамя ўсяго іншага, Федэрацыя трансфарміравалася ў Асацыяцыю, заснавальнікамі якой выступілі 10 арганізацый і ў якую ўвайшлі гарналыжныя цэнтры краіны, дзяржаўныя і камерцыйныя прадпрыемствы.

Аляксандр НІКАНОРАЎ.

Праваабаронца Валерый Шчукін збірае міласціну, каб выплаціць судовы штраф

Як патлумачыў В.Шчукін карэспандэнту БелаПАН, ён змушаны прасіць міласціну, каб выплаціць судовы штраф па іску намесніка дырэктара Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці Таццяны Буевіч за нанесены маральны ўрон.

12—13 жніўня праваабаронца прасіў міласціну на пераходным мосце цераз чыгуначныя пуці, каля дома, дзе пражывае Т.Буевіч. Потым — каля будынка абласнога архіва, дзе яна працуе. Шчукін, калі звяртаецца да прахожых па дапамогу, раздае ім інфармацыйныя ўлёткі, у якіх тлумачыць сутнасць свайго канфлікту з чыноўніцай. Інцыдэнт адбыўся падчас апошніх выбараў у мясцовыя саветы, калі Буевіч, якая ў той час з'яўлялася сакратаром абласной выбарчай камісіі, не прапусціла Шчукіна на пасяджэнне камісіі. Суд прызнаў Шчукіна вінаватым у абразе і пастанавіў выплаціць Т.Буевіч 250 тысяч рублёў.

12 жніўня, калі праваабаронца ўпершыню выйшаў прасіць міласціну, ён паспеў сабраць невялікую суму — 1200 рублёў і быў затрыманы міліцыяй. Праз некаторы час, пасля праверкі тэксту ўлёткі, яго адпусцілі.

Таццяна ЧАБАТАРОВА.

СКАНДАЛ

Кто поставил фингал Зенону Ломатю?

Председатель Комитета госконтроля Зенон Ломать не желает рассказывать журналистам о том, кто и при каких обстоятельствах недавно посадил ему синяк под левым глазом.

Из-за чего сыр-бор

Напомним, что генпрокуратура Беларуси возбудила уголовное дело по факту нападения в Могилеве на председателя Комитета государственного контроля **Зенона Ломатя.** Информация о том, что Ломатю поставили фингал, появилась сразу после отставки бывшего председателя КГБ Беларуси **Степана Сухоренко** и его первого заместителя **Василия Дементея**. Некоторые интернет-ресурсы сообщили, что руководство КГБ сняли из-за того, что главного контролера Беларуси избили именно гэбисты, прикрывшись удостоверениями сотрудников МВД. Писали о том, что это была якобы *"тщательно спланированная провокация с целью компрометации министра внутренних дел Владимира Наумова"*. На различных сайтах утверждалось, что бандитов удалось задержать и ими оказались семеро сотрудников КГБ и один сотрудник Совета безопасности.

Представляя в должности нового руководителя КГБ **Юрия Жадобина**, А.Лукашенко сказал: *"Уже сегодня на определенных сайтах в Интернете, в желтой прессе мусолятся последние факты вашей противоправной деятельности. Это касается и председателя Комитета госконтроля Зенона Ломатя, и так далее... Я не позволю в стране создавать какую-то напряженность, чтобы люди, особенно высокие должностные лица, которые должны спокойно работать, боялись принимать решения, и не дай Бог еще, чтобы с оглядкой ходили по улицам"*.

Кто автор «брыдятины»?

Однако экс-глава КГБ **Степан Сухоренко** в интервью "Народной воле" заявил, что это какая-то нелепая провокация против него самого, о которой он якобы ничего не знал.

"Я сразу сказал, что это какая-то нелепая провокация, — сказал Степан Николаевич. — *По сей день не могу понять конечной цели этого мероприятия. Зачем? Кто это все придумал? Я эту ситуацию анализировал... С одной стороны — ну дали кому-то в глаз, что здесь такого? А с другой... Я когда разложил все, проанализировал... Мое мнение, что это провокация. Чистейшей воды провокация! Я никогда не занимался кулуарными играми или чем-то еще. У меня была стратегическая задача — безопасность в стране. А такие вещи... Заниматься подобными делами ниже моего достоинства. Я уже потом узнавал в ходе разборок самые разные версии и не мог понять, зачем это все сделано. Даже если кто-то за кем-то следил, фотографировал, зачем было стучаться, лезть, снимать... Я все это называю одним словом — брыдятина..."*

Верить или не верить?

Никаких официальных сообщений по данному делу нет. Сотрудники пресс-центра генпрокуратуры говорят: *"мы пока не можем дать никаких сведений по данному делу"* — и отказываются назвать не только фамилию следователя, который занимается расследованием, но и статью, по которой возбуждено уголовное дело! Вот такая непонятная секретность...

Между тем в прокуратуре утверждают, что у них якобы нет информации о том, что арестованные — сотрудники КГБ и Совета безопасности.

"Это другие люди", — твердо говорят там. Можно ли верить этим словам в свете таинственного молчания, не известно.

Заместитель генерального прокурора Беларуси **Степан Косуха**, которому дозвонилась "Народная воля", услышав вопрос о **Зеноне Ломате**, ни секунды не раздумывая, ответил: *"У меня совещание, я сейчас занят"*, — и, не попрощавшись, положил трубку.

Не хочет вдаваться в подробности случившегося с Ломатем и председатель Могилевского облисполкома **Борис Батура,** который одним из первых узнал об инциденте.

"Все уже написано в газетах, большего добавить не могу, — говорит Борис Васильевич. — *Могу сказать, что я лично плохо отношусь к тому, что случилось, считаю, что такого не должно быть"*.

Синяк под левым глазом у **Зенона Ломатя** уже давно прошел. Но Зенон Кузьмич не желает рассказывать о том, при каких обстоятельствах получил синяк под глазом. В пресс-службе Комитета госконтроля сказали, что у Зенона Ломатя *"нет возможности"* ответить на вопросы "Народной воли", связанные с инцидентом в Могилеве.

Что говорят...

Из-за отсутствия достоверной информации тему избиения Ломатя продолжают мусолить и в чиновничьих кругах.

Ходят разговоры, что **Зенон Ломать** будто бы категорически отказался прислушиваться к советам госсекретаря Совета безопасности **Виктора Шеймана**. И обо всех проверках, в том числе и в силовых ведомствах, он докладывал напрямую А.Лукашенко, иной раз подставляя того же Шеймана.

Говорят, будто те, кто избивал Ломатя, при задержании предъявили документ, что данная акция санкционирована. И что на той бумаге якобы стояла подпись первого заместителя председателя КГБ **Василия Дементея**, который будто бы получил некие гарантии и указания в Совете безопасности. По слухам, среди арестованных — сотрудники управления КГБ по защите Конституционного строя и начальник оперативного отдела Совета безопасности. Однако в Совбезе и КГБ данную информацию не подтвердили.

"Я посмотрел — многих начальников отделов не нашел на рабочем месте, — сказал "Народной воле" начальник пресс-службы Совбеза **Владимир Нестерович.** — *Но все при делах. Кто-то в командировках, кто-то контрольно-инспекторские проверки сейчас осуществляет в силовых министерствах, кто-то отдыхает..."*

Чиновник, оглянись!..

Самое удивительное, что вся эта неясность и предельная "затуманенность" дела о фингале Ломатя играют против самого Зенона Кузьмича (если молчит — значит, получил за дело) и престижа белорусской власти в целом. Надавали тумаков одному из высших должностных лиц страны, а фамилии виновников "стесняются" назвать.

Значит, кому-то действительно выгодно, чтобы большие чиновники ходили по улице с оглядкой?..

Марина КОКТЫШ.

ГРОМКОЕ ДЕЛО

О судьбе экс-директора «Белнефтехима» ничего не известно

Александр Боровский, арестованный Комитетом государственной безопасности по обвинению в совершении ряда должностных преступлений около трех месяцев назад, по-прежнему под следствием, но о его деле официальные лица предпочитают не распространяться.

Как сообщил электронная газета "Ежедневник", согласно данным КГБ, пробыв в должности всего 1,5 года, **Александр Боровский** сумел создать и организовать преступную группу из числа руководителей концерна и некоторых коммерческих структур. Группа создала такую схему закупок нефти и реализации нефтепродуктов, при которой получала незаконный доход. Эти действия следствие оценивает как хищение путем злоупотребления служебными полномочиями и, собственно, злоупотребление служебными полномочиями. Кроме того, для реализации схемы хищения, по данным следствия, Боровский умышленно разглашал сведения, составляющие служебную тайну, — об условиях закупки нефти и продажи нефтепродуктов. Как заявил генеральный прокурор Петр Миклашевич, общая сумма похищенного преступной группой исчисляется не одним миллионом долларов.

Освободив Александра Боровского от занимаемой должности председателя концерна "Белнефтехим", **Сергей Сидорский** некоторое время никого не назначал на его место. Понятно, что кандидатура преемника согласовывалась с Александром Лукашенко. 24 июля новым руководителем был назначен **Валерий Казакевич**.

Предшественник Боровского на должности директора "Белнефтехима" **Бронислав Сивый**, с которым пообщался корреспондент "Народной воли", на тему ареста его "коллеги" распространяться не хочет. Оно и понятно. Сейчас Бронислав Петрович, освобожденный от должности в декабре 2005 года, спокойно работает начальником главного управления перспективного развития и инвестиций того же концерна "Белнефтехим".

"Дело Боровского покрыто тайной и мраком, — рассказал мне один из сотрудников концерна. — *У нас вообще ходили слухи, что после смены руководства КГБ повыгоняли половину следователей, которые начинали дело нашего бывшего шефа. Но это, конечно же, всего лишь слухи..."*

"Без комментариев", — говорят сегодня в Центре информации и связей с общественностью КГБ Беларуси, когда журналисты интересуются "делом Боровского".

Алесь СВЕТЛАНИЧ.

Хочаце — верце, хочаце — не верце

Практычна на апошніх гектарах вядзецца абмалот зерневых у сельскіх гаспадарках краіны. Калі верыць справаздачным лічбам, то збор каласавых і бабовых падбіраецца пад 7 мільёнаў тон. Праўда, усе ведаюць, што гэта бункерная вага, а не амбарная, як і тое, якіх размахаў дасягнулі прыпіскі. Таму канкрэтную лічбу можна было б назваць пасля рэйду кантралёраў. Але, кажуць, да "Дажынак" яны будуць заняты іншай работай.

Тамара СІДАРАВА.

Каму патрэбны буракі?

Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі шукае рынкі збыту для 1 млн тон цукровых буракоў.

Як паведаміў намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання **Васіль ПАЎЛОЎСКІ**, сёлета ўраджай цукровых буракоў ў краіне складзе не менш як 3,9 млн тон, у той час як магутнасці прадпрыемстваў Беларусі дазваляюць перапрацаваць толькі 3 млн тон. Таму прыблізна 1 млн тон цукровых буракоў неабходна рэалізаваць па-за межамі краіны.

Наталля КАРОТКАЯ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
17 ЖНІЎНЯ 2007 г.

У Магілёве супрацоўнікі міліцыі ўварваліся ў прыватны дом

У ім праходзіла сустрэча маладзёжных актывістаў. У сустрэчы бралі ўдзел прыблізна 30 чалавек, у тым ліку па тры грамадзяніны Германіі і Польшчы.

Паводле слоў аднаго з удзельнікаў сустрэчы **Зміцера САЛАЎЁВА**, прысутныя спачатку вырашылі не адчыняць дзверы. Пасля доўгіх перамоў была дамоўленасць, што супрацоўнікі міліцыі толькі правераць дакументы.

Калі ж дзверы адчынілі, у памяшканне ўварвалася пяць супрацоўнікаў міліцыі. Яны паводзілі сябе нахабна, паведаміў З.Салаўёў. *"Адной з прысутных журналістак міліцыянеры заламалі рукі і адабралі ў яе фотаапарат. Пасля пачалі правяраць дакументы ў нашых іншаземных гасцей. У некаторых іх не было пры сабе, і яны былі вымушаны пайсці ў гатэль "Магілёў", дзе спыніліся, каб паказаць іх,* — расказаў актывіст. — *У гатэль таксама прыехаў кіраўнік аддзела міграцыі* **Аляксандр ВАЛАДЗЬКОЎ,** *які праводзіў допыт іншаземцаў аб мэтах іх візіту ў Беларусь і задаваў пытанні аб тым, чым яны займаліся ў прыватным доме па Чкалава, 16".*

Пасля праверкі дакументаў усе ўдзельнікі сустрэчы, у тым ліку замежныя госці, былі адпушчаны.

З.Салаўёў лічыць, што супрацоўнікі міліцыі без законных падстаў уварваліся ў прыватны дом, чым парушылі Канстытуцыю. У найбліжэйшы час маладзёжныя актывісты падрыхтуюць скаргі на дзеянні супрацоўнікаў міліцыі.

Ігар БАРЫСАЎ.

ПАЗІЦЫЯ

Калі па-беларуску загаворыць народная душа...

Уладзімір КУЛАЖАНКА, *прафесар*

Усё часцей у незалежным друку з'яўляюцца выступы ў абарону роднай мовы, бо цягам апошніх дзесяці год ідзе інтэнсіўны наступ на ўсё беларускае, на сам нацыянальны дух.

Нягледзячы на тое, што наша нацыянальная мова з'яўляецца дзяржаўнай, афіцыйна яна нідзе не выкарыстоўваецца. Ва ўрадзе — не, у войску і міліцыі — не, у вышэйшай школе — амаль не. Нават тэлебачанне ў асноўным вядзецца на мове суседняй дзяржавы. Уключыш "ящик" і не адразу разумееш, адкуль ідзе перадача. І толькі тады, калі пачуеш, што асвятляюцца падзеі ў Гомелі, Брэсце ці Віцебску — даходзіць, што трансляцыя з Мінска. Хіба адзін журналіст Рэвуцкі радуе беларускай мовай, дай Бог яму здароўя!

Фактаў масавай знявагі беларускай мовы хоць адбаўляй. Ёсць сярод іх нават кур'ёзныя. Прыязджае ў Беларусь, да прыкладу, прадстаўнік Літвы ці Польшчы, сустракаецца з высокімі афіцыйнымі чыноўнікамі і пачынае гаварыць па-беларуску, а ў адказ яму — мова расійская. Хіба не сорам? Або такое. У гэтым годзе каталіцкі і праваслаўны Вялікдзень супалі ў часе. Вяліся тэлевізійныя перадачы богаслужэння. І ўсе пераканаліся: каталіцкія святары маліліся па-беларуску, а праваслаўныя служыцелі культа карысталіся моваю ўсходняга суседа. Але ж мову нашаму народу даў сам Бог, і маліцца яму лепш на роднай мове!

Канешне, рана ці позна пераможа справядлівасць, і наша мова будзе адноўлена ў правах. Ёсць жа гістарычны факт: яўрэі аднавілі спачатку сваю мову, а затым і дзяржаву нават праз 2000 гадоў!

Як вядома, у Расіі 2007 год аб'яўлены годам рускай мовы. Чаму б нам не зрабіць тое самае адносна сваёй? Наша мова хіба гэтага не заслугоўвае? Ды не — наш галоўны кіраўнік паабяцаў "не стаяць в стороне" менавіта ад расійскай акцыі... Там, дзе мова прыгожа гучала, яе прыдушылі. Напрыклад, раней у Міністэрстве замежных спраў прэс-сакратар рабіў па тэлебачанні паведамленні на мілагучнай нашай мове. А зараз...

Некаторыя расійскія і не толькі палітыкі часта заяўляюць, што Беларусь і Расія — адно і тое ж, і таму нашай краіне трэба проста далучыцца да Расіі. Менавіта пад націскам суседняй дзяржавы ў нас вядзецца такая жорсткая асіміляцыйная палітыка. Крыўдна глядзець і чуць, як выступаюць высокія чыноўнікі: ніводнага беларускага слоўца. Нібы няма беларускай нацыі і не існуе яе мова. І гэта прытым, што яшчэ 450 гадоў таму наша гістарычная дзяржава — Вялікае княства Літоўскае — мела сваю Канстытуцыю (Статут Вялікага княства Літоўскага), напісаны па-беларуску. Ён выкарыстоўваўся болей за 400 гадоў! А ў Масковіі пад той час, як кажуць, яшчэ і конь не валяўся на прававым полі. Толькі пры рускім цары Аляксеі Міхайлавічу (на 150 год пазней) было прынята "Уложение", спісанае фактычна са Статута ВКЛ, толькі моцна пагоршанае.

І наогул, яшчэ не вырашана праблема з назвай Беларусі. Так была названа наша краіна з часоў імператрыцы Екацярыны II, пасля захопу ВКЛ. А мы ж — ліцвіны, і тое, што Жамойція атрымала нашу назву, нічога не мяняе. Праўда, з гэтае прычыны шмат блытаніны на ніве не толькі гістарычнай навукі, але і грамадскай. Так, філосаф А.Бірала ў 1972 годзе ў выдавецтве БДТУ выдаў манаграфію пад назвай "Філасофская і грамадская думка ў Беларусі і Літве ў канцы XVII, сярэдзіне XVIII ст.". Бачыце, у назве і змесце ідзе гаворка пра дзве краіны — Беларусь і Літву. Але пад згаданы перыяд ніякай Беларусі не існавала. Літва — гэта і ёсць Беларусь! Невыпадкова наш горад Брэст меў назоў **Брэст-Літоўскі.** Палякі падчас свайго тут панавання (1920—1939 гг.) адкінулі ў назве горада "Літоўскі" і дадалі "над Бугам". Бальшавікі ў сваю чаргу адкінулі і першае, і другое, і мы маем зараз **проста горад Брэст.** Ну зусім як такі ж у Францыі...

Ёсць безліч прыкладаў таго, што наша зямля цягам стагоддзяў мела назву *Літва*. Паглядзіце, колькі ў нас пайшло прозвішчаў ад Літвы — Літвіненка, Літвінка, Літвіновіч і г. д. У Кармянскім раёне ёсць вялікая вёска Ліцвінавічы, у іншых месцах вёскі з назвай Літва ды іншымі вытворнымі назвамі. Або такі бытавы факт: падчас працы ў Дзівіне (зараз Кобрынскі раён) на пачатку 50-х гадоў мінулага стагоддзя я чуў ад селяніна Фёдара Любчука такое меркаванне аб жыхарах вёскі Хабовічы, што ў дзесяці кіламетрах на поўнач ад Дзівіна: "О, гэтыя ліцвякі". Значыць, дзесь недалёка была мяжа рассялення ліцвінаў. Шчыра кажучы, тады я не разумеў гэтага. Аказваецца, мінуўшчына жыве ў народзе і дасюль.

Канечне, назва нашай краіны і мова яго народа маюць агульнае значэнне. Але пакуль мы звяртаемся да падтрымання сваёй мовы з яе сённяшняй назвай. Гэта надзвычай актуальна. Чаму прэзідэнт краіны зрабіў сваёй газетай "Советскую Белоруссию", а не "Звязду"? І цяпер высокія начальнікі патрабуюць, каб усе падпісваліся на "С.Б.". А чаму няма такога шчыравання наконт беларускіх выданняў?

Пасля захопу нашай дзяржавы Літвы — Расіяй ніколі не ствараліся ўмовы для развіцця і шырокага ўжытку нацыянальнай мовы. Былі асобныя перыяды ажыўлення, адраджэння (20-я і 90-я гады мінулага стагоддзя). Але яны былі надта кароткімі, адраджэнцаў хутка абвінавацілі ў "нацыяналізме", падвяргалі рэпрэсіям. Быў і такі кароткі эпізод у 1953 годзе, пасля смерці Сталіна: Л.Берыя напісаў запіску ў ЦК адносна парушэнняў "ленинской национальной политики" ў моўным пытанні. Ва Украіне і ў Беларусі па загадзе з Масквы пачалі ўводзіць нацыянальную мову. Аргументацыя і патрабаванні былі настолькі моцныя, што ў імгненне вока была раскуплена беларуская літаратура, узрасла падпіска на беларускія газеты. Пад той час я вучыўся ў рэспубліканскай Вышэйшай партыйнай школе, і яе дырэктар, усімі паважаны былы партызанскі камандзір Ілля Кошар загаварыў па-беларуску. Але гэтае безумоўна правільнае памкненне было хутка прыпынена...

Усходні прэсінг адносна беларускай мовы ў наяўнасці і сёння, бо ёсць сілы, якія паставілі мэтай ліквідацыю беларускай нацыі. Сродак гэтага — перш за ўсё вынішчэнне нацыянальнай мовы, — падмурка самасвядомасці народа. Для адводу вачэй ужо падрыхтаваны законапраект "Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі", які прадстаўлены ў Нацыянальны сход РБ. Значэнне будучага закона падрабязна разглядае старшыня профільнай камісіі парламента Уладзімір Здановіч у артыкуле "Ад мовы залежыць існасць Беларусі" (апублікаваны 8 мая ў "Звяздзе"). Мяне артыкул У.Здановіча ўразіў тым, што ён напісаны так, нібыта мова наша шырока выкарыстоўваецца, жыве і працвітае. І для яе далейшага ўзмацнення трэба ўнесці "ўсяго толькі сякіятакія" папраўкі... Якое ж гэта фарысейства, калі наша мова проста вынішчаецца! У парламенце яе зусім не чуваць. І сёння патрэбны закон аб шырокім яе выкарыстанні, адраджэнні і дзяржаўнасці.

Нельга не зазначыць, што і наша апазіцыя не вядзе настойлівай барацьбы за беларускасць. Большасць яе лідэраў не ўжывае беларускую мову. Яны ўпускаюць самае галоўнае, лічаць гэта дробязным, другарадным, выяўляючы сваю палітычную слепату. Упэўнены, каб беларуская эліта, большая частка інтэлігенцыі, увесь час карысталася паўсюль роднай мовай, то сёння не было б такой пагражальнай сітуацыі, небяспекі нашай незалежнасці і нават існаванню самой тытульнай нацыі.

Як ні сумна прызнаваць, але большасць лідэраў апазіцыі — — свядома ці несвядома — льюць ваду на расійскі млын, карыстаючыся амаль выключна рускай мовай. А робяць пры гэтым выгляд, быццам выступаюць за незалежнасць, суверэнітэт. Між тым беларуская мова такая багатая, эмацыянальная, гнуткая і паэтычная, што яе проста нельга не любіць. Тыя палітычныя дзеячы і інтэлігенты, якія паслядоўна карыстаюцца родным словам, відавочна выйграюць у вачах людзей, а таму маюць шмат прыхільнікаў. Не магу не назваць тут імёны: да прыкладу, паважаных Зянона Пазьняка, Станіслава Шушкевіча, Вінцука Вячоркі, Пятра Краўчанкі ды іншыя. Пачытайце ў "Народнай волі" за 23 верасня 2006 г. артыкул Пятра Краўчанкі "А ці будзем мы жыць?", і вы пераканаецеся, якой эмацыянальнай мовай ён валодае і як умела ёю карыстаецца.

А ў гэты час вялікі гурт палітыкаў па невядомай прычыне ўвесь час ужываюць мову суседзяў. (А.Лябедзька, генерал В.Фралоў, С.Багданкевіч ды іншыя.) Скажу шчыра: лічу А.Лябедьку таленавітым палітыкам, які можа прэтэндаваць на лідэрства ў апазіцыі. Але сваёй рускамоўнасцю ён прайграе ў вачах свядомай часткі народа.

Вельмі радуюся, калі вядомы філосаф В.Оргіш на старонках "Народнай волі" піша на роднай мове. Але гэта бывае гады ў рады. І пасля ўсяго гэтага мы хочам, каб нас, беларусаў, паважалі ў свеце, прызнавалі за еўрапейскі народ, якім мы ёсць па сваёй сутнасці!

Адраджэнне беларускай дзяржаўнасці і нацыі пачнецца тады, калі яе лідэры стануць на пазіцыі адраджэння нацыянальных карэнняў і менталітэту. Толькі тады загаворыць народная душа. Трэба вучыцца ў французаў, якія некалькі год таму забілі трывогу пра чысціню французскай мовы, супраць яе засмечвання ангельскімі словамі. Нам бы такія праблемы...

Актывісты дапамогуць стварэнню «чорных спісаў»

Адзін з мілінкевічаўскіх актывістаў Юрась Губарэвіч паведаміў пра новую ініцыятыву.

"У Мінску і ў рэгіёнах мы пачалі ўдакладняць спіс прозвішчаў беларускіх чыноўнікаў на візавыя санкцыі ЗША. Мэта — вызначыць "заслугі" канкрэтных афіцэраў МУС і КДБ, старшыняў абласных і раённых судоў і асоб іншых катэгорый, якія пераследуюць людзей з апазіцыйных партый і рухаў".

Паводле слоў Юрася Губарэвіча, толькі сёлета праз суды на Брэстчыне прайшло больш за 60 актывістаў апазіцыі.

"Кожны з пацярпелых можа дакладна паведаміць падрабязнасці затрымання і ўдакладніць прозвішчы выканаўцаў", — адзначае Юрась Губарэвіч.

Першая гасцініца для сабак і кошак

У канцы гэтага года ў Мінску плануецца пачаць будаўніцтва гасцініцы для жывёл.

Яна будзе прызначана для ўтрымання сабак і кошак. Апрача часовага размяшчэння жывёл, прадугледжаны шэраг дадатковых паслуг: цырульня, мыццё і нават пашыў адзення. Пры будынку гасцініцы плануецца адкрыць краму аксесуараў і кармоў для жывёл. Гэта будзе першая ўстанова ў Беларусі, што легальна аказвае такія паслугі.

Усе, хто жадае дапамагчы бяздомным жывёлам або ўзяць выхаванца, могуць звяртацца па тэлефонах: (8 029) 630-79-33, 878-79-33.

Анастасія ЯНУШЭЎСКАЯ.

ЭШЕЛОНЫ ВЛАСТИ

Министру архитектуры и строительства повысили зарплату

Пару недель назад министр архитектуры и строительства Александр Селезнев докладывал Лукашенко о перспективах по увеличению объемов строительства жилья в Минске.

"Народная воля" решила узнать, где живет сам министр.

"У меня двухкомнатная квартира в Казарменном переулке, — ответил Александр Ильич. — *Квартира не служебная, а своя. Строил я ее в 2003—2004 годах. Я был приглашен сюда в 2001 году и ожидал служебное жилье. Но мне предложили сразу построить квартиру. Мы взяли кредит и вложили деньги в строительство. Дети у меня уже взрослые — у них свои квартиры. Сын живет в Могилеве, у него тоже двухкомнатная квартира".*

Кстати, жена и дети Селезнева тоже трудятся в строительной отрасли.

"Сын работает мастером на стройке, его жена — юрист, — охотно рассказал Александр Ильич. — *Дочь — экономист, тоже работает в строительной фирме, зять — дорожный строитель. И жена у меня строитель — мы с ней вместе учились. Она мне всегда помогает. И без ее помощи я бы никогда не достиг таких высот".*

Министр архитектуры и строительства не прочь обзавестись загородным домом.

"Дачи у нас пока нет, но, будем надеяться, получится оформить участок, и тогда будем строить", — говорит Селезнев.

Ходили слухи, что Александр Селезнев пытается получить участок под дачу недалеко от президентской резиденции "Дрозды", где уже облюбовали земли многие высокопоставленные чиновники. Однако Александр Селезнев не стал говорить, какой именно участок он пытается получить.

"Вы так все выспрашиваете... Это же почти интимный вопрос..." — сказал он.

Зато Александр Ильич рассказал, что сравнительно недавно ему повысили зарплату.

"Есть две категории министерств, — говорит Селезнев. — *К первой относятся все силовики, Минфин, Минэкономики, Минпром и Минсельхозпрод. Мы раньше находились во второй категории, но в этом году нас отнесли к первой. Разница между зарплатами министров первой и второй категории — примерно 10 процентов. В среднем у меня в месяц получается, наверное, три миллиона. Нам с женой этих денег хватает. Дети, как я уже говорил, живут самостоятельно..."*

ВОПРОС РЕБРОМ

Сколько стоит "Минск-Арена"?

Накануне Дня строителя журналисты спросили у министра архитектуры и строительства, какова примерная стоимость суперсовременного спортивного комплекса "Минск-Арена", строительство которого весьма активно ведется на проспекте Победителей.

"Я считаю, что мы духовно уже выросли, чтобы иметь возможность проводить международные соревнования в нашей стране, — сказал Селезнев. — *До сегодняшнего дня мы не имели возможности провести международные соревнования по хоккею, по другим видам спорта, потому что у нас не позволяли условия. Что касается заверений о том, что "Минск-Арена" будет такой современной, я подтверждаю, что этот объект — единственный в Европе. У нас появится велотрек, где мы сможем воспитывать будущих чемпионов, будет прекрасная ледовая арена на 15 тысяч мест. Да, это недешевая задумка — примерная оценочная стоимость объекта около 150 миллионов долларов. Но я считаю, что этот комплекс того стоит".*

Курочкина не посадят?

"Народная воля" спросила у Александра Селезнева, интересуется ли он судьбой своего предшественника Геннадия Курочкина, который в последнее время вынужден был объясняться со следователями. Напомним, что, обращаясь с посланием к Палате представителей и белорусскому народу, А.Лукашенко со ссылкой на министра внутренних дел Владимира Наумова заявил, что бывшего министра архитектуры и строительства Геннадия Курочкина надо немедленно посадить.

"Прихожу на субботник, мне министр внутренних дел честно, в глаза, при бывшем министре строительства, Курочкине, говорит: его надо немедленно посадить! — сказал Лукашенко. — *Я говорю: а чего ты мне об этом говоришь, у тебя что, полномочий нет?! Я, говорит, внес Сидорскому предложение и написал, за что. Он не успел возглавить... проектный институт, как уже там начал ковырять под те миллионы долларов, которые мы выделяем на строительство этого спортивного комплекса (имеется в виду "Минск-Арена".* — **Ред.**)*! Ну так разберитесь и посадите: и его, и тех, кто его прикрывает. Вот и все".*

"Я не буду давать никаких оценок, — ответил Селезнев. — *Было поручение главы государства, ведется следствие. В кратчайшие сроки его результаты станут известны. Я могу сказать только одно: состава преступления со стороны Курочкина нет. Можно было назвать это некой халатностью, допущенной в связи с излишней осторожностью при выборе того или иного субподрядчика. Потому что если берешь некоего субподрядчика по проектированию оборудования, то берешь на себя некие обязательства — почему ты именно его выбрал? Исполнители побоялись, он не принял свое решение. Но никакого ущерба Республике Беларусь и данному объекту нанесено не было. Уже два месяца ведется следствие, и те, кому было поручено, во всем разберутся. Будем надеяться, что Курочкин не заслуживает наказания и никакой меры к нему применено не будет.*

Когда закончится следствие? Это никто четко не может гарантировать. Но оно уже подходит к завершению, уточняются позиции..."

Геннадий Курочкин, который пока возглавляет институт "Белгоспроект", от каких-либо комментариев по данному вопросу воздерживается.

Марина КОКТЫШ.

Проект Евросоюза: мобильный хоспис

Белорусский паллиатив начался в 1990-е годы с того, что группа неравнодушных, столкнувшихся со смертью детей, со страданиями их семей, начала организовывать детский хоспис. Государство будто наблюдало со стороны: не особенно вмешиваясь и не спеша на помощь. Белорусам помогали страны Евросоюза — финансами, наработками, тренингами для будущих специалистов. Теперь в стране есть и детские, и взрослый хоспис. Помощь в появлении взрослого оказал удачно реализованный проект "Создание первого мобильного хосписа для взрослых в Республике Беларусь", профинансированный программой Европейского Союза ТАСИС.

Хоспис — это благотворительная организация, медицинское и социальное учреждение. Здесь осуществляется уход за раковыми больными на последней стадии болезни.

Начало проекта

Основной идеей проекта стала адаптация западной модели мобильного хосписа для взрослых пациентов к условиям нашей страны. Необходимость в нем была — прежде всего в Минске, где по всем показателям самый высокий процент онкологии в Беларуси. А реалии диктовали необходимость расходовать имеющиеся средства с максимальной пользой для нуждающихся в паллиативной помощи — тяжело и безнадежно больных. Для реализации проекта в стране существовали определенные условия — были высококвалифицированные специалисты и организации, имеющие опыт работы с неизлечимо больными. Проект начался с определения группы получателей помощи (152 человека и 364 их родственника), выявления их потребностей, обучения персонала, лекций для работников системы здравоохранения и социальной защиты. Был проведен тендер и закуплено необходимое оборудование, закуплены средства ухода и медико-социальной помощи, организована служба сиделок.

Почему — мобильный?

Существует определение паллиативной помощи как помощи в улучшении качества жизни пациентов и их семей, столкнувшихся с неизлечимой болезнью, путем предотвращения и облегчения страданий, контроля боли и других физических, психосоциальных проблем. Семья больного забирает родного человека домой, поскольку больничные условия чаще всего не соответствуют в их сознании понятию *спокойная смерть.* Этим семьям не нужен постоянный контроль и вмешательство. Но порой возникают сложные ситуации, которые и способны разрешить специалисты — медики, психологи, работающие в мобильной бригаде. Особенность именно мобильных бригад — индивидуальный подход. Таких бригад было создано две.

Довольно быстро стало ясно — модель мобильного хосписа себя оправдала, доказав не только свою экономичность, но и гуманность. Медики хосписа в сотрудничестве со специалистами из Австрии выработали индивидуальные схемы обезболивания и схемы систематического приема препаратов, схемы наиболее распространенных реакций на препараты. Наработанные алгоритмы используются в практике и сейчас.

Для координации действий была подключена горячая линия для членов семей больных — она принимала ежедневно по 15—20 звонков, что помогало оперативно реагировать на сложные житейские ситуации.

В рамках проекта (бюджет которого составил 250 тысяч евро) была создана информационно-методическая база для последующей работы в сфере паллиативной помощи, обучено несколько сотен специалистов государственных медицинских учреждений и общественных организаций, обеспечена информационная поддержка. Фактически проект окончен, но его наработки используются и сейчас — в государственном взрослом хосписе.

Что еще было нужно?

Специалисты отмечают: Беларуси нужны мобильные хосписы — и взрослые, и детские. Особенно те, которые бы действовали в чернобыльских районах, где уровень медицинской помощи недостаточно высок, в отличие от уровня онкопатологий. Такой проект Европейский Союз готов был финансировать снова, однако срок его реализации истек еще на этапе утверждения государственными органами.

История: первый хоспис был открыт в Лондоне в 1967 г. Он стал не только больницей, но и центром обучения, дающим знания и опыт тем, кто работает с безнадежно больными. Данное учреждение послужило началом хосписного движения, открытию новых хосписов и изменением отношения в обществе к проблемам неизлечимо больных людей.

Данная публикация подготовлена при содействии Европейского Союза и не обязательно отражает официальную точку зрения ЕС. За дополнительной информацией обращайтесь на сайт www.delblr.ec.europa.eu

СТАЛІЦА

Вуліцы Свабоды ў Мінску больш няма

Замест яе з'явілася вуліца курсанта Дзмітрыя ГВІШЫАНІ.

Такое рашэнне нядаўна прынялі дэпутаты Мінскага гарадскога савета.

Нагадаем, што брэстаўчанін Дзмітрый Гвішыані загінуў у ноч на 1 верасня 1999 года. Ён быў курсантам Ваеннай акадэміі, і 28 жніўня разам з аднакурснікамі вяртаўся з летніх канікул на вучобу на цягніку Брэст—Мінск. У пяці кіламетрах ад станцыі Драгічын цягнік загарэўся. Разам з сябрам Раманам Кундам Дзмітрый дапамагаў тушыць пажар і атрымаў жудасныя апёкі. У ноч з 31 жніўня на 1 верасня ён памёр у бальніцы. Хлопцу было ўсяго дваццаць год. У 1999 годзе курсант Дзмітрый Гвішыані быў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам "За асабістую мужнасць". У 2004 годзе на тэрыторыі Ваеннай акадэміі быў адкрыты помнік Дзмітрыю Гвішыані. У сярэдняй школе №30 г.Брэста ёсць памятны знак і алея Дзмітрыя Гвішыані. У сакавіку гэтага года курсанта навечна залічылі ў спісы асабістага састава агульнавайсковага факультэта Ваеннай акадэміі.

Прысвоіць імя курсанта Дзмітрыя Гвішыані адной з мінскіх вуліц прапанавалі дэпутатам гарсавета актывісты БРСМ. Дэпутаты выбралі для перайменавання вуліцу Свабоды ў мікрараёне "Усход", якая мае аднайменную назву з плошчай Свабоды.

Новым вуліцам, якія зараз праектуюцца, будуць прысвоены імёны выбітных беларускіх пісьменнікаў, паэтаў, навукоўцаў, кампазітараў, грамадскіх дзеячаў. Так, у Мінску з'явяцца вуліцы Яна Чачота, Напалеона Орды, Уладзіслава Галубка, Ежы Гедройца, Усевалада Ігнатоўскага, супругаў Аладавых, Алеся Гаруна, Іосіфа Жыновіча.

Цікава, чаму нельга было назваць імем Гвішыані таксама адну з праектуемых вуліц і чаму не пераймяноўваюць вуліцу Маскоўскую, аднайменную са станцыяй метро, што знаходзіцца зусім у іншым раёне горада? Можа, улады лічуць, што ў Мінску зашмат свабоды?

Вальжына КОРСАК.

В Вену и Будапешт

Белорусская железная дорога в декабре нынешнего года введет в обращение беспересадочные вагоны Минск—Вена и Минск—Будапешт.

Планируется, что беспересадочные вагоны из Минска в Вену будут курсировать один раз в неделю, а из Минска в Будапешт — два раза в неделю через Братиславу.

Народная Воля http://www.nv-online.info
17 ЖНІЎНЯ 2007 г.

ДИСКУССИЯ

О радикалистах и «желтой майке» лидера

Прошло три месяца после майского Конгресса демократических сил, но в центре и в регионах, на страницах свободной печати не прекращается дискуссия, связанная с его решениями, с действиями оппозиции в складывающейся ситуации. Звучат разные оценки, высказываются разные точки зрения о месте и роли, состоянии и влиянии оппозиции на развитие политической ситуации в стране. Мнения зачастую прямо противоположные.

Как участник двух последних Конгрессов и связанных с ними мероприятий, хотел бы высказать свое видение происходящего.

Как известно, на Конгрессе демократических сил рассматривались два принципиальных вопроса. Во-первых, стратегия и план действий оппозиции, программа экономических и политических преобразований в переходный период от диктатуры к демократической республике и, во-вторых, формирование руководящих органов ОДС.

По первому вопросу столкнулись два разных подхода к борьбе за демократические преобразования в обществе. Приняв большинством голосов разработанную оргкомитетом "Экономическую платформу" и "Малую конституцию", Конгресс определил путь мирной эволюции, сделал акцент на диалог оппозиции с обществом, элитами и властью в сочетании с давлением на власть с помощью кампании акций протеста. Данный план действий предполагает бескровный переход от диктатуры к демократии.

Сторонники радикальной точки зрения делают упор на тактику давления на власть, на проведение уличных акций. Наиболее яркие сторонники этой стратегии Николай Статкевич и Павел Северинец в самом начале форума весьма эмоционально отстаивали альтернативную точку зрения, поставив проведение Конгресса под угрозу срыва. В их выступлениях на Конгрессе, а затем и в печати, по моему мнению, больше эмоций, чем основанных на реалиях жизни аргументов. Но их в какой-то мере можно понять. Отсидев на "химии" и выйдя на свободу в преддверии Конгресса, они были настроены революционно, готовы были идти на "баррикады", жертвуя собой.

Труднее принять доводы других сторонников решительных действий, пытающихся аргументировать их реальность и эффективность. Среди них одним из самых заметных, судя по многочисленным выступлениям в печати, является доктор философских наук Вячеслав Оргиш. Остановимся только на одной из его публикаций в газете "Народная воля" №91—92 от 08.06.2007 г. Защищая стратегию радикального подхода как основного направления деятельности демократических сил, он, ссылаясь на результаты данных Независимого института социально-экономических и политических исследований, утверждает, что *"в акциях протеста против ухудшения своего материального положения готовы участвовать 18,1 процента опрошенных"*. И далее: *"Только в столице это 200 тысяч потенциальных протестующих, а по стране — около 2 миллионов!"* Просто здорово, не правда ли?

Но давайте попытаемся спокойно проанализировать приведенные автором цифры.

Во-первых, позволю себе усомниться в реальности приведенного процента. Я не проводил специальных социологических исследований, но хорошо знаю настроение жителей 272-квартирного дома, в котором жил более 20 лет, и 108-квартирного, в котором живу последние четыре года. В них проживает примерно тысяча человек. Здесь мне лично довелось собирать подписи во время трех последних избирательных кампаний. Лишь в самых смелых мечтах можно предположить, что из этих двух домов в акциях протеста примут участие 180 человек. Было бы очень хорошо, если бы вышло на порядок меньше. От декларированного в анкете намерения до реального действия — дистанция огромного размера. И это в областном центре. Сколько же человек выйдут на акции протеста из числа 2623 тысяч сельских жителей, а также проживающих в райцентрах и других небольших городах нашей страны?

Во-вторых, 18,1 процента от 9.714.200 жителей страны (данные по состоянию на 01.01.2007 г.) — это не 2 миллиона, как утверждает автор, а только 1.758.260 человек. Разбежка почти в четверть миллиона. Это даже похлестче выдающегося организатора *"элегантных"* побед на выборах и референдумах Л.Ермошиной, сумевшей с июля по октябрь 2004 года в преддверии последнего референдума умыкнуть "всего лишь" 137 тысяч избирателей.

И, наконец, в-третьих. Правильно проведя арифметическую операцию по нахождению процента от числа, последовательный критик принятых Конгрессом решений включил в число потенциальных протестующих не только взрослых, но и детей, включая новорожденных. Ведь 18,1 процента — это от числа опрошенных, надо полагать, взрослых людей, а не от всего населения страны. Посему никак не получится, как бы этого ни хотелось, ни 200 тысяч, ни тем более 2 миллионов протестующих. По крайней мере сегодня.

Кстати, интересно было бы узнать, в каких протестных акциях участвовал сторонник *"улицы"* Вячеслав Оргиш? Какие лично организовывал?

Спустимся, коллеги, на грешную белорусскую землю. Реалии, к сожалению, не подтверждают оптимистических призывов сторонников решительных действий. Об этом свидетельствуют попытки провести в последние годы различные акции протеста в столице и других городах страны. Почему такая ситуация, это предмет другого разговора.

По большому счету, рассматриваемые в ходе Конгресса стратегии принципиально друг от друга не отличаются. Предложенная оргкомитетом Стратегия не отвергает уличного давления на власть. Уличные акции как метод борьбы с режимом, вне всяких сомнений, должны присутствовать. Важно только, чтобы они являлись частью общей стратегии, имели четко очерченные цели и задачи и реально прогнозируемые результаты. Каждая акция должна посвящаться конкретной волнующей людей проблеме, тщательно готовиться. Крайне важно использовать при их проведении нестандартные действия.

Предлагаемые *"круглые столы"* рассматриваются не как средство, а как конечная цель, исключающая хаос и беспорядок при переходе от диктатуры к демократии.

В то же время альтернативная стратегия не имеет своей целью использование силовых вариантов захвата власти и фактически является составной частью общей стратегии. При резком ухудшении социально-экономической ситуации возможно нарастание протестных настроений и включение в массовые акции большей части населения.

Пересмотр принятой стратегии, оперативная коррекция стратегических решений, если ситуация будет требовать этого, вполне возможен.

Мая маладафрантаўская дзейнасць пачалася ў 14 год, але я заўсёды памятала пра тое, што я гаспадыня ў хаце, і на маіх плячах ляжыць клопат пра тое, каб у хаце было чыста і ўтульна, і заўсёды быў прыгатаваны абед.

Брат у мяне ўсё жыццё быў выдатнікам. БДУІР скончыў з чырвоным дыпломам. Зараз працуе праграмістам. Калі напішу дзе, болей працаваць там не будзе.

Адносіны з ім самыя што не найлепшыя, але пытанні маёй дзейнасці мы абмінаем. Ён паважае мае пазіцыі, але для яго галоўнае, каб у першую чаргу я атрымала добрую адукацыю для нейкіх дальнейшых крокаў у жыцці.

Хаця з братам, дарэчы, мы зусім не падобныя. Ён усё жыццё быў больш памяркоўным, сур'ёзным. А я ў дзяцінстве ўвесь час была вясёлай, непрадказуемай. Ды і хвалявалі нас у жыцці зусім розныя паняцці ды каштоўнасці.

На жаль, мой брат сустрэўся з маёй палітычнай пазіцыяй не самым лепшым чынам. У час ператрусу ў мяне, як і ў маіх паплечнікаў, канфіскавалі камп'ютэр, дзе была падрыхтаваная праца брата, над якой ён доўгі час працаваў. Але, зразумеўшы, дараваў.

Тата ў мяне па адукацыі ваенны палітолаг. Менавіта таму ніколі не вітаў маёй цікавасці да палітычнай сітуацыі ў краіне. І нават вельмі рашуча спрабаваў прыпыніць маю маладафрантаўскую дзейнасць. Але ў час маёй крымінальнай справы, у час допытаў ды суда ён сапраўды зразумеў, як важна гэта для мяне і наколькі я шчыра люблю займацца грамадскай дзейнасцю.

Хаця, на жаль, з-за маёй любові да краіны, да праўды мой тата страціў вельмі прэстыжную працу. Тут я, безумоўна, адчуваю сябе вінаватай. І яшчэ раз упэўнілася ў тым, што вярхушка нашай улады гуляе ў вельмі брудныя гульні, калі спрабуе ціснуць на кожнага актывіста за кошт яго блізкіх, нават не задумваючыся пра лёсы людзей.

— Вы мінчанка. Часцей гарадскія жыхары аддаюць перавагу рускай мове. Вы ж трапілі ў беларускамоўнае асяроддзе і размаўляеце па-беларуску. Адкуль у Вас гэта?

— Калі я трапіла ў маладафрантаўскі асяродак, мяне прыемна ўразіла, што ўсе людзі там так прыгожа размаўляюць на роднай беларускай мове! Я адчула, што гэта вельмі лёгка і натуральна! І я загаварыла...

— Вы хацелі стаць настаўніцай беларускай мовы і літаратуры. Не засмучае, што настаўнікі цяпер не ў пашане, дый грашовая складаючая гэтай прафесіі пакідае жадаць лепшага? Выбралі ўжо, у якую ВНУ пойдзеце вучыцца?

— Я прыкладу ўсе намаганні, каб паступіць у беларускую ВНУ, але мяркую, што давядзецца навучацца за мяжой. Бо наша сістэма адукацыі (як і палітычная сістэма ўвогуле) не церпіць альтэрнатыўнага меркавання, як і ўсяго таго, што выходзіць за межы лукашэнкаўскай ідэалогіі.

— А як паставіцца да Вашай прафесіі будучы муж? Ці сваю другую палавінку Вы мяркуеце падабраць па нейкіх асаблівых прыкметах і з вызначанымі ўжо Вамі параметрамі і характарам?

— Мне б школу скончыць... А калі сур'ёзна, то я не лічу, што сваю другую палавінку можна падабраць па нейкіх прыкметах... Параметры — гэта для аўтамабіляў і бытавой тэхнікі, а не для пачуццяў...

— У Вашым узросце любая дзяўчына ці юнак ужо перажылі сваё першае каханне. Што запомнілася з таго і ці не хацелася б нешта забыць?

— Прыватнае жыццё — яно на тое і прыватнае, каб не рабіць яго публічным. А стараццца забыць — гэта падманваць саму сябе. Бо першае каханне — яно не забываецца, дый гэта бясцэнны досвед, тое, што ты будзеш прыгадваць на працягу жыцця.

— Вам, пяцярым "маладафрантаўцам", у маі "пашанцавала": за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі нікога не кінулі за краты. Цяпер жа супраць Вашых паплечнікаў у рэгіёнах вядуць крымінальныя справы па тых жа абвінавачваннях. За што Вам не даюць спакою?

— Наш суд прыпаў на час, калі разглядалася пытанне пра гандлёвыя прэферэнцыі. І на той момант уладзе было выгадна даць нам мінімальнае пакаранне. Але гэта не азначае, што ў краіне пачаліся дэмакратычная пераўтварэнні. На гэты момант за кратамі па-ранейшаму застаецца шэраг палітвязняў, у тым ліку лідэры незарэгістраванага "Маладога фронту" Зміцер Дашкевіч і Артур Фінькевіч, чакаюць суда Настасся Азарка, Іван Шыла і Яраслаў Грышчэня. Мы ўсе з'яўляемся разменнай манетай у палітычных гульнях кіраўнікоў нашай дзяржавы.

Гутарыў Георгій ГЛЕБУСЬ.

«Белавежскае сафары» скончылася скандалам

Група актывістаў Беларускага экалагічнага руху распаўсюдзіла адкрыты зварот да грамадзян краіны з нагоды рэкламавання на айчынным тэлебачанні забойстваў жывёл у нацыянальных парках Беларусі. Падставай для пратэсту стаў відэафільм АТН (Агенцтва тэлевізійных навін) "Беловежское сафари", які 30 ліпеня 2007 году дэманстраваўся на Першым канале Беларускага тэлебачання. Згаданы відэафільм з'яўляецца часткай праекту Аляксандра Зімоўскага "Нацыянальныя паркі Беларусі".

На працягу амаль паўгадзіны тэлегледачоў знаёмілі з індустрыяй забойства дзікіх жывёл. Прычым гэта адбывалася не ў нейкай звычайнай паляўнічай гаспадарцы, а ў знакамітым Нацыянальным парку "Белавежская пушча". Стваральнікі фільма (аўтар сцэнарыя — Дзяніс Кур'ян) падрабязна распавядалі і паказвалі, як замежныя госці забіваюць аленяў, дзікоў на тэрыторыі запаведніка. У відэафільме нават быў выкарыстаны эпізод, зняты на мабільны тэлефон, калі паляўнічыя сабакі разрываюць на часткі дзіка.

Аўтары звароту лічаць, што дэманстрацыя па тэлебачанні сцэн жорсткага абыходжання з жывёламі недапушчальная. Яны перакананыя, што ў Еўропе такі выпадак выклікаў бы скандал нацыянальнага маштабу і скончыўся б судовай справай для асоб, якія спрычыніліся да такога здарэння.

Беларускія эколагі патрабуюць "спыніць у нацыянальных СМІ рэкламу забойстваў жывёл на тэрыторыях, што знаходзяцца пад асаблівай аховай", бо гэта ёсць не толькі амаральны і экалагічна шкодны занятак, але і кампраметуе дзяржаўныя прыродаахоўныя ўстаноў перад цывілізаваным светам. *"Работнікі прыродаахоўных устаноў, тыя, хто павінен у першую чаргу адстойваць маральныя, экалагічныя і юрыдычныя прынцыпы аховы дзікіх жывёл, на самай справе з'яўляюцца прапагандыстамі ганебнай ідэалогіі камерцыйнага паляванння"*, — гаворыцца ў звароце групы беларускіх эколагаў. Яны просяць усіх свядомых грамадзян краіны падтрымаць іх ініцыятыву і накіраваць свае лісты пратэсту на БТ.

Мікола Статкевіч стаў выязным

4 жніўня старшыня аргкамітэта па стварэнні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная грамада) Мікола Статкевіч стаў выязным. АГІМ Першамайскага раёна Мінска даў дазвол на выезд палітыка ва ўсе краіны свету.

Нядаўна Мікола Статкевіч вызваліўся ўмоўна-датэрмінова з "хіміі", якую адбываў па абвінавачванні ў арганізацыі масавых беспарадкаў супраць фальсіфікацыі вынікаў рэферэндуму і выбараў у Палату прадстаўнікоў у 2004 годзе. Такая "аператыўнасць" улад не можа не радаваць. Да прыкладу, Сяргей Скрабец ужо колькі часу спрабуе атрымаць дазвол на выезд, але — не даюць.

Глеб ХМЯЛЬНІЦКІ.

Новы альбом «Песняроў»

У верасні выйдзе новы альбом беларускага дзяржаўнага ансамбля "Песняры".

Ён складаецца з 11 кампазіцый, большасць з іх напісана мастацкім кіраўніком ансамбля Вячаславам Шарапавым. На дыску таксама ёсць песні на музыку Міхала Клеафаса Агінскага, Ігара Лучанка, Аляксандра Журбіна. Сярод аўтараў тэкстаў - Якуб Колас і Генадзь Бураўкін.

Кампазіцыі новага дыска ўжо выконваліся ў рамках канцэртнага тура "Песняроў" па гарадах Беларусі. Канцэртны тур цягнуўся больш за два гады і завяршыўся выступленнем у Белдзяржфілармоніі 28 чэрвеня.

Папярэдні альбом "Песняроў" з'явіўся ў 2001 годзе, яшчэ пры жыцці Уладзіміра Мулявіна.

Анастасія ЯНУШЭЎСКАЯ.

Народная Воля http://www.nv-online.info 17 ЖНІЎНЯ 2007 г.

БАМОНД

Нэлі Багуслаўскую выпісалі з бальніцы

Зараз народная артыстка Беларусі знаходзіцца дома.

Нагадаем, 10 ліпеня Нэлі Багуслаўская пасля некалькіх канцэртаў на "Славянскім базары ў Віцебску" трапіла ў рэанімацыю з сардэчным прыступам.

Муж Нэлі Захараўны кампазітар **Ізмаіл КАПЛАНАЎ** паведаміў "Народнай волі", што ў мінулую пятніцу спявачку нарэшце выпісалі з бальніцы.

"*Нэлі Захараўна адчувае сябе так, як і любы чалавек пасля інфаркту*, — кажа Ізмаіл Львовіч. — *Дзякуючы намаганням урачоў і, напэўна, таму, што людзі хацелі яе выздараўлення, маральна падтрымлівалі, яна ўжо дома. Вядома,*

Нэлі Захараўна не збіраецца пакідаць прафесію, але спяваць пакуль не можа — трэба ж накапіць сілы. Мы абяцаем, што, як толькі гэта будзе магчыма, абавязкова вернемся на сцэну. Нам гэтага вельмі хочацца..."

Андрусь ЛЯСКО.

Святлана БАРОЎСКАЯ: «Я вельмі стамілася ад глабальнай занятасці...»

Апошнім часам актрыса і тэлевядучая Святлана БАРОЎСКАЯ стала даволі рэдка з'яўляцца ў эфіры ранішняй перадачы "Добрай раніцы, Беларусь!". У каля-тэлевізійных колах нават пачалі гаварыць пра тое, што Бароўскую быццам бы звальняюць з тэлебачання.

"Народная воля" вырашыла пацікавіцца ў Святланы, што ж здарылася насамрэч.

— Па шчырасці, мне падабаецца мець шмат эфіраў, але ў нас такі фармат: тры пары вядучых, таму атрымліваецца толькі два эфіры на тыдзень, — распавядае Святлана. — Ніякіх праблем з кіраўніцтвам канала ў мяне няма. А ў эфіры мяне не было таму, што мой партнёр **Аляксандр ПАЎЛАЎ** трапіў у бальніцу на тыдзень. І паколькі я ўсё адно была вымушана не працаваць, то вырашыла з'ездзіць адпачыць. Як кажуць, не было б шчасця, ды няшчасце дапамагло... Да таго ж я вельмі стамілася ад глабальнай занятасці. І з'ехала ў адпачынак у Турцыю. Спецыяльна выбрала гатэль, у якім белыя нумары. Уяўляеце, тут усё белае! Вось зараз ляжу на вялізным белым квадратным матрацы, тут абслугоўваючы персанал таксама ў белым, у нумары акварыумы з залатымі рыбкамі. Я тут проста лаўлю кайф! Ляжу каля мора і пракручваю ў галаве сюжэты курортных раманаў. Праўда, толькі ў думках — бо ўсе мужчыны, якія мне падабаюцца, адпачываюць з дзецьмі і жонкамі. Тут амаль няма рускіх, толькі італьянцы, егіпцяне, немцы. Напэўна, таму, што гатэль не сістэмы "ўсё ўключана"...

Я звычайна з'яўляюся ў эфіры па аўторках і пятніцах, але ў бліжэйшыя пару тыдняў гледачы будуць мяне бачыць тры разы на тыдзень.

Кацярына АНДРЭЙЧАНКА.

Искуи Абалян и Александр Патлис снова вместе

После небывалого успеха песни "Другая жизнь", которую Искуи Абалян и Александр Патлис исполнили в дуэте, исполнители решили продолжить свое сотрудничество. С недавнего времени в радиоэфире зазвучит их новый хит — "За облаками".

— *Идея создания второго совместного дуэта родилась сама собой*, — рассказывает Искуи. — *Нам с Сашей комфортно работать вместе на сцене, да и в жизни мы дружим, по возможности помогаем друг другу и советом, и делом. Песня "За облаками", конечно же, о любви, в ней много романтики и красивой ностальгии. Причем первый раз песня была записана где-то полтора года назад, но из-за поломки компьютера вокальные треки были утеряны. В итоге пришлось записывать все заново.*

БЕЗ ГАЛЬШТУКА

Аляксей ЯНУКЕВІЧ:

«Дзяўчаты, якія маглі б стаць маімі жонкамі, раўнавалі мяне да палітыкі...»

Беларускіх палітыкаў, якія могуць без комплексаў распавесці пра сваё асабістае жыццё і нават узгадаць першы сексуальны вопыт, можна пералічыць па пальцах. Намеснік старшыні Партыі БНФ Аляксей ЯНУКЕВІЧ адзін з тых, хто не лічыць патрэбным штосьці хаваць.

— Нядаўна прачытала ў Інтэрнэце, што Вы — кадравы афіцэр КДБ. Гэта праўда?

— Вядома, няпраўда. Ніколі ніякіх кантактаў з прадстаўнікамі спецслужб у мяне не было. Я таксама не агент ЦРУ, Масада ці МІ-6.

— У старшыні Партыі БНФ Вінцука Вячоркі ажно чатыры наменікі! І Вы — адзін з іх. Навошта так многа? Што ўваходзіць у Вашы абавязкі?

— Я займаюся перадусім міжнароднай дзейнасцю і партыйным будаўніцтвам. На самай справе, чатыры намеснікі — не так ужо і шмат, магло б быць і больш. Ёсць дзве асноўныя прычыны. Папершае, сёння БНФ — адна з найбуйнейшых апазіцыйных партый у Беларусі. Па-другое, партыя рэгулярна ўдзельнічае ў арганізацыі масавых акцый, і часта бывае так, што адразу некалькі наменікаў ці старшыня апынаюцца на нарах. І тыя, хто застаўся на волі, займаюцца арганізацыйнімі пытаннямі.

— Многія апазіцыйныя палітыкі вельмі падобныя да Лукашэнкі ў тым, што ўтойваюць сваё асабістае жыццё. Як Вы лічыце, прыватнае жыццё палітыка павінна быць як на далоні?

— У мяне няма ніякага сумневу, што палітыку трэба быць як на далоні. Жыццё палітыка мусіць быць значна больш празрыстым, чым жыццё іншага грамадзяніна, бо ад гэтых людзей залежыць лёс дзяржавы і народа. Але я перакананы, што ёсць нейкая мяжа, якую ўвага грамадства і ўвага СМІ не павінна пераходзіць.

— Тады давайце пагаворым пра Ваша асабістае жыццё. Вам 31 год, і, наколькі мне вядома, Вы дагэтуль не жанаты. Чаму? Зусім нядаўна Вы так ахвотна распавядалі "Народнай волі" пра свае раманы на семінарах, значыць, праблем у стасунках з супрацьлеглым полам у Вас няма...

— Я не лічу, што ў маім узросце быць халасцяком — гэта праблема. Заўжды думаў, што жаніцца раней за трыццаць — гэта несур'ёзна. Гэта значыць, што адказнасць за тваю сям'ю, за тваіх дзяцей будуць несці больш твае бацькі, чым ты сам. Бываюць нейкія выключэнні, але я лічу, што трэба жаніцца тады, калі ты адбыўся як мужчына, маеш нейкі статус у грамадстве, моцна стаіш на зямлі ў фінансавым плане. А калі казаць пра мяне асабіста, то, напэўна, тыя дзяўчаты, якія маглі б стаць маімі жонкамі, раўнавалі мяне да палітыкі, альбо яны самі былі не гатовы выхадзіць замуж, хоць я быў не супраць. Але я на гэты конт не заганяюся, бо ўпэўнены, што ў мяне будзе добрая сям'я, добрая жонка і дзеці.

— Чула ад некаторых мужчын такое меркаванне: "Няма розніцы, з кім класціся ў ложак — з БРСМаўкай ці апазіцыянеркай". Для Вас маюць значэнне палітычныя перакананні Вашай дзяўчыны?

— Я думаю, што мог бы мець пэўныя стасункі з дзяўчынай з БРСМ. Хоць раней такога досведу ў мяне не было. А вось з супрацоўніцай КДБ я б не стаў сустракацца. Бо да людзей, што там служаць сёння, у мяне няма ніякай павагі. І, натуральна, у мяне не маглі б узнікнуць пачуцці да дзяўчыны, якая б не паважала мае погляды і перакананні. Іншых абмежаванняў я не бачу.

— А як павінна выглядаць дзяўчына, каб Вам спадабацца?

— Мне дзяўчыны ўсе падабаюцца! Я мяркую, кожная дзяўчына, калі адчувае сябе камфортна і бачыць, што падабаецца табе, можа і выглядаць вельмі прыцягальна, і ўзбуджаць пачуцці. Мне падабаюцца славянкі, і перадусім беларускі. Паездзіўшы па свеце, я магу шчыра сказаць, што ў Беларусі прыгожых дзяўчат больш, чым у любой іншай краіне.

— У барда Зміцера Бартосіка ёсць песня "Сексрэвалюцыйная", дзе ўзнімаецца дэмаграфічная праблема. Чаму б Партыі БНФ не ўзяць да ўвагі ідэю "працаваць гарызантальна"?..

— Дэмаграфію падымаць сапраўды трэба. Мяркую, што Партыі БНФ сапраўды варта было б заняцца гэтай тэмай. Бо пытанне здаровых сем'яў вельмі важнае. Праўда, "рэцэпты", што падаюцца ў песні Бартосіка, напэўна, не вельмі нам падыходзяць. Там вядзецца гаворка не пра ўмацаванне сем'яў, а пра механічнае павелічэнне беларускага насельніцтва. А што датычыцца колькасці народжаных шчырых беларусаў, наш лідэр Вінцук Вячорка — добры прыклад у гэтым плане, у яго трое дзяцей.

— Негатыўнае стаўленне да апазіцыянераў у многіх звязана з тым, што партыйныя дзеячы збольшага беспрацоўныя. Вы таксама. Дык на што Вы жывяце? Ці плацяць Вам заробак у партыі?

— У партыі грошы мне не плацяць. Але я лічу, што гэта выдаткі нашай палітычнай сітуацыі. Я перакананы, што людзі, якія добра працуюць дзеля партыі і прысвячаюць ёй значную частку жыцця, мусяць атрымліваць за гэта грошы, каб не думаць, дзе шукаць сродкі для існавання. Асабліва ў рэгіёнах. У гэтым няма нічога несумленнага. Асабіста я жыву заробкам, які складаецца з таго, што я раблю пераклады з нямецкай мовы, а таксама пішу артыкулы і рэцэнзіі і выступаю як эксперт па палітычных пытаннях у розных праграмах і атрымліваю за гэта ганарары. Не магу сказаць, што я галадаю. На жыццё мне хапае. Але той факт, што гэта нерэгулярны заробак, мяне не радуе.

— Вы агучвалі ролі ў перакладах на беларускую мову фільмаў "Любоў насамрэч" і "Крымінальнае чытво". Цікава, Вам плацілі за гэта грошы? І як Вы лічыце, чаму для агучвання запрашалі палітыкаў, а не прафесійных акцёраў?

— Я мяркую, што ідэя арганізатараў была ў тым, каб прыцягнуць да перакладаў фільмаў увагу як мага большай колькасці людзей, прынамсі ў свядомым грамадстве, праз далучэнне да праекта вядомых асоб. Грошай за гэта не плацілі. Фінансавае пытанне ў такіх культурніцкіх праектах для мяне ніколі не стаіць.

— А Вы не марылі пра акцёрскую кар'еру? Наколькі мне вядома, Вы ігралі ў школьным драмгуртку...

— Так, але жадання зняцца ў фільме ў мяне няма. Можа быць, таму, што публічны палітык — гэта акцёр. Не таму, што ён паказвае з сябе нешта, чым не з'яўляецца. А таму, што ён увесь час "на сцэне", увесь час у полі ўвагі вялікай колькасці людзей. Ад гэтага я атрымліваю задавальненне, калі сустракаюся з людзьмі, калі ўдзельнічаю ў публічных дэбатах.

— Вы жывяце ў асобнай кватэры?

— Не, я жыву з бацькам, мама памерла тры гады таму. Мог бы здымаць кватэру, але не бачу неабходнасці. Набыць, натуральна, не змог бы. Апошнім часам кошты на нерухомасць так узляцелі, што я не разумею, дзе беларусам браць сродкі, каб набыць кватэру.

— А машына ў Вас ёсць?

— Так, "Audi 100" 1990 года выпуску. Магчыма, праз год ужо давядзецца яе мяняць, але я яе вельмі люблю. Гэта вялікая камфортная машына з вялікім багажнікам.

— Вы можаце сабе дазволіць сходзіць з дзяўчынай у рэстаран?

— Канешне, магу. Адзін я не пайшоў бы ў рэстаран. І я заўжды плачу за дзяўчыну ў рэстаране.

— Вам як палітыку, напэўна, даводзіцца кантактаваць з рознымі групамі насельніцтва. А ці ёсць у Вас знаёмыя ва ўладзе, якія могуць нешта падказаць, параіць?

— З тымі людзьмі, якія сапраўды маюць уплыў ва ўладзе, у мяне стасункаў няма. Ёсць стасункі ў асноўным з людзьмі майго пакалення, з якімі я вучыўся ці быў знаёмы ў школе, ва універсітэце. Я скончыў факультэт міжнародных эканамічных адносін БДЭУ па спецыяльнасці "Кіраванне знешнеэканамічнай дзейнасцю". Гэта людзі ў бізнесе, у тым ліку дзяржаўным, таксама людзі, блізкія да кіраўніцтва дзяржаўных прадпрыемстваў, якія маюць дастаткова высокія пасады ў міністэрствах. Яны цікавяцца, што дзеецца ў свеце, якія ёсць перспектывы міжнароднага супрацоўніцтва ў Беларусі. І таксама яны могуць даць мне інфармацыю аб уладзе, якую можна атрымаць толькі ад людзей, што працуюць унутры сістэмы.

— Як Вас наогул занесла ў палітыку?

— Мяне занесла ў палітыку ў 1996 годзе, калі навучаўся ва універсітэце, на хвалі росту нацыянальнай самасвядомасці і пратэстаў супраць палітыкі Лукашэнкі. Тады я адчуў, што не магу стаяць убаку ад працэсаў, якія адбываюцца ў грамадстве, мушу ў іх удзельнічаць. І я заўсёды лічыў Партыю БНФ той структурай, у якой я магу належным чынам скарыстаць свае сілы. Тады, уступіўшы ў партыю, я яшчэ не думаў пра тое, каб займацца палітыкай. Але хутка я стаў намеснікам старшыні Чыжоўскай суполкі. Калі стаў утварацца "Малады фронт", я актыўна працаваў там. Але ў 2000 годзе я і шэраг маіх сяброў сышлі адтуль. У мяне быў выбар: займацца палітыкай ці ісці, напрыклад, у бізнес. І я вярнуўся ў Партыю БНФ, палічыўшы, што магу рэалізавацца тут як палітык...

Вальжына КОРСАК.

На фота: *Аляксей Янукевіч разам з Джорджам Бушам і ў святой крыніцы ў Пустынках, каля Мсціслава.*

ТЕНДЕНЦИИ

Осенние тренды

До официального наступления осени остается совсем немного — однако, как известно, готовить сани народная мудрость предлагает летом. По крайней мере именно такого подхода придерживаются магазины, постепенно освобождая место под осенние коллекции. А значит, и нам следует знать заранее, что следует приобрести или же просто достать с верхних полок — к осени.

Вне сомнения, осенью в моде будут оттенки серого. Не стоит думать, что серый предназначен исключительно для тусклых и невзрачных нарядов: нужно просто скомбинировать его с горячими цветами сезона: например, ярко-пурпурным или неоново-голубым в стиле восьмидесятых.

Особое внимание осенью следует уделить рукавам: это могут быть рукава-фонарики, рукава-колокол или рукав длиной в три четверт. Главное — создаваемый образ должен быть выдержан в духе женственности и ретро-гламура. Для тех, кто влюблен в серебро и золото, радостной новостью станет то, что металлические цвета останутся в моде и осенью.

Конечно, осенние оттенки металлического будут более приглушенными, однако серебро и золото останутся актуальными. К ним добавятся цвета меди и стали. Еще немного блеска добавит тренд, принесший популярность лакированной коже, — сумки, обувь и длинные перчатки из лакированной кожи не только черного, но и красного и пурпурного оттенков станут актуальными аксессуарами. Однако наиболее актуальным в осеннем сезоне будет мех: все усилия "сознательных" дизайнеров пойдут прахом. Ничто не помешает популярности меха осенью, будь то пальто или жакет с меховой отделкой или аксессуары с мехом.

Однако и некоторые летние вещи можно смело носить осенью, ведь многие из них являются практически внесезонными.

Таким внесезонным предметом гардероба, к примеру, являются платья с цветочным принтом. Казалось бы, одежда абсолютно летняя и ни с чем, кроме летних же босоножек на платформе, не сочетающаяся. Однако модные критики утверждают, что осенью такое платье вполне можно носить — с плотными колготками, кардиганом и высокими ботинками.

То же самое касается и шортов: шорты-бермуды, которые так по-летнему смотрятся с платформами, осенью будут сочетаться с водолазкой, приталенным жакетом или кардиганом, колготами и обувью на высоком каблуке. Короткие жакеты, которые летом можно носить с чем угодно — начиная от джинсов и шортов и заканчивая платьями, осенью можно надеть с широкими брюками/джинсами и водолазкой. То же самое касается и аксессуаров ярких цветов — очень модными будут сумки большого размера оттенков оранжевого, красного, пурпурного.

Обязательно стоит оставить к осени и белые брюки, которые летом комбинируются практически с любым топом или футболкой. Осенью белые брюки стоит сочетать с жакетами, вязаными водолазками, кардиганами. Особенно свежо белый будет выглядеть в сочетании с темными и насыщенными оттенками коричневого и черного.

Вновь возвращаются в моду шерстяные и твидовые береты — скошенные набок, они отлично смотрятся как с классическим пальто, так и с более современным спортивным нарядом. Береты этой осенью приветствуются яркие, с принтами и аппликациями и даже с круглыми пушистыми помпонами.

10 самых актуальных трендов осени 2007:

— Шерстяное платье-трапеция
— Пальто-пончо
— Брюки-галифе
— Коктейльное платье цвета "металлик"
— Кожаные или лакированные ботфорты
— Твидовый берет
— Крупная бижутерия
— Объемный шарф-палантин
— Плотные шерстяные колготки
— Юбка-тюльпан с завышенной талией

СВЕЦКАЯ ХРОНІКА

У цэнтры Мінска захапілі ў закладнікі супрацоўніцу БАЖ і патрабавалі за яе выкуп

...Такога ў Мінску яшчэ не было! У мінулы чацвер каля 15.00 у раёне плошчы Перамогі іншамарка цёмнага колеру на вялікай хуткасці падрулiла да аднаго з будынкаў і рэзка затармазіла ля яго ўваходу.

"Рабаўнікі", — адразу ж прапанаваў сваю версію хтосьці з прысутных. Некаторыя ад граху падалей і наогул кінуліся ўбок.

На "рабаўніках" былі чорныя маскі і чамусьці каскі англійскіх паліцэйскіх. Людзі ў цывільным апаратыўна запіхнулі маладую дзяўчыну ў аўтамабіль і зніклі гэтак жа хутка, як і з'явіліся.

"Імперыялісты скралі", — з гумарам дадумвалі ўслых тыя, хто яшчэ не збег, і ўжо праз некалькі хвілін стала вядома, што скрадзеная дзяўчына — **Зоя МАРДАС** — працуе ў ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў".

Старшыня БАЖ **Жанна Мікалаеўна ЛІТВІНА** адрэагавала на скраданне сваёй супрацоўніцы імгненна. *"Рыхтуй калым!"* — заявіла яна яшчэ аднаму нашаму калегу (акрамя ўсяго іншага, ён яшчэ добра вядомы як аўтар многіх песень рок-гурта "Крама") **Зміцеру ЛУКАШУКУ**, які літаральна за некалькі хвілін да надзвычайнага здарэння ўзяў законны шлюб з Зояй і знаходзіўся ў прастрацыі ці то ад урачыстасці моманту, ці ад скрадання жонкі.

Зрэшты, усё добра, што добра скончваецца. Зміцер аказаўся не скупым чалавекам, а "тэрарысты" не вельмі патрабавальнымі.

Пасля вызвалення нявесты ўрачыстасць працягнулася ў "Віленскай карчме" ў Траецкім прадмесці, дзе маладых і віншавалі.

Першы сведка — вакаліст гурта "Крама" Ігар ВАРАШКЕВІЧ жадаў кахання, Жанна Літвіна — павагі адзін да аднаго. Прагучалі нават імправізаваныя вершаваныя радкі:

Каб не заблытацца
ў безлічы сцяжын,
Каб перажыць
усе выпрабаванні,
Два позіркі, два сэрцы,
дзве душы
З'ядналіся пяшчотай
і каханнем.

У добры шлях —
праз дні і гарады
Пад промнем шчасця
незгасальнай зоркі.
А гэты дзень хай пройдзе
праз гады
Магутным воклічам,
магутным крыкам: "Горка!"

Мы таксама далучаемся да віншаванняў: як кажуць, жывіце, дзеці, шчасліва!

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

СКАНДАЛ

Допінгавая эпідэмія

Беларускі спорт працягваюць страсаць допінгавыя скандалы

На гэты раз забароненае рэчыва фурасемід знойдзена ў арганізме нашай дзевятнаццацігадовай лёгкаатлеткі **Алены Івановай.**

На прайшоўшым нядаўна маладзёжным чэмпіянаце Еўропы ў Венгрыі наша спартсменка заняла чацвёртае месца ў скачках у вышыню. Там у яе была ўзята допінг-проба, якая дала станоўчы вынік. Згодна з правіламі міжнароднай антыдопінгавай арганізацыі, спартсмен, які злоўлены на допінгу, абавязкова накіроўвае на адрас гэтай арганізацыі тлумачальную запіску, у якой павінен быць пазначаны спіс тых прэпаратаў, якія ўжывае атлет. Іванова так і зрабіла, паведаміўшы, што ніякіх забароненых прэпаратаў, само-сабой, не ўжывала...

Калі так, то лагічна было б пагадзіцца на ўскрыццё так званай пробы В, якая магла б зняць усе пытанні наконт прымянення допінгу. Аднак галоўны трэнер зборнай Беларусі па лёгкай атлетыцы Анатоль Бадуеў, адзначыў што Іванова ад ускрыцця другой пробы адмовілася. Справа ў тым, што допінгавыя даследаванні — рэч нятанная, а ўскрыццё і аналіз другой пробы ажыццяўляецца за кошт спартсмена. Калі другая проба абвяргае вынікі першага аналізу, грошы спартсмену вяртаюцца. Так ці іначай, але Іванова адмовілася ад магчымасці выйсці "сухой" з допінгавай гісторыі. У гэтым выпадку выканкам Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі, падпарадкоўваючыся міжнародным нормам, прыняў рашэнне аб адхіленні Івановай ад удзелу ў спаборніцтвах.

Цягам бліжэйшага часу свае санкцыі ў дачыненні да беларускай спартсменкі прыме і Міжнародная федэрацыя лёгкай атлетыкі. Хутчэй за ўсё гэта будзе двухгадовая дыскваліфікацыя, а гэта значыць, што Алена Іванова на пекінскую Алімпіяду не паедзе...

Насцярожвае тое, што допінгавыя скандалы ўзнікаюць з дзіўнай рэгулярнасцю. Той жа самы фурасемід крыху раней быў знойдзены ў арганізме 21-гадовай цяжкаатлеткі Таццяны Грамыка і 20-гадовай Васілісы Марзалюк, якая займаецца вольнай барацьбой. Не можа не насцярожваць даволі юны ўзрост усіх трох спартсменак, якія былі злоўленыя надопінгу. Зразумела, трэнеры і дактары ў адзін голас адмаўляюцца ад таго, што прапаноўвалі спартсменкам ужываць забароненыя прэпараты. Можна, канечне, падазраваць, што недзе на зборах, размаўляючы паміж сабой, спартсменкі рэкамендавалі адна адной ужываць забароненыя прэпараты для дасягнення лепшых вынікаў, аднак гэта толькі гіпотэза...

У любым выпадку факты — рэч упартая. А яны сведчаць аб тым, што допінгавыя скандалы не могуць узнікаць на пустым месцы: тут альбо адказныя за "чысціню" спартсменаў людзі нешта не даглядаюць, альбо самі спартсмены ўжываюць тое, чаго не трэба. Іншага не дадзена.

Праз некалькі гадоў у Беларусі пачне функцыянаваць уласная антыдопінгавая лабараторыя. Атрыманне ліцэнзіі на такую дзейнасць — справа не аднаго дня. Праўда, колькі маладых і перспектыўных спартсменаў трапяць у непрыемнае становішча з-за допінгу, колькі алімпійскіх надзей будзе не спраўджана — пытанне рытарычнае...

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

МАЗАІКА

Чатыры медалі плюс тры ліцэнзіі

У мінулую нядзелю ў Дуйсбургу завяршыўся чэмпіянат свету па веславанні на байдарках і каноэ, у якім удзельнічалі беларускія спартсмены.

Беларусы заваявалі адзін залаты медаль, два сярэбраныя і адзін бронзавы. Акрамя таго, нашы весляры сталі ўладальнікамі трох алімпійскіх ліцэнзій на Алімпіяду ў Пекіне.

"Золата" і "серабро" на дыстанцыі суадносна 200 і 500 метраў заваявалі Раман Пятрушэнка і Вадзім Махнеў. Яшчэ адзін сярэбраны медаль прыдбаў наш квартэт у складзе Станіслава Стрэльчанкі, Дзяніса Жыгадлы, Сяргея Фіндзюкевіча і Руслана Бічана.

У спаборніцтвах каноэ-чацвёрак беларусы Дзмітрый Рабчанка, Дзмітрый Вайцішкін, Канстанцін Шчарбак і Аляксандр Валчэўскі сталі бронзавымі прызёрамі чэмпіяната свету.

Рыхтуем сані летам

Беларуская федэрацыя гандбола завяршыла работу над праграмай турніраў і спарынгаў для мужчынскай зборнай Беларусі, якая рыхтуецца да фіналу чэмпіянату Еўропы-2008 у Нарвегіі.

З 26 па 28 кастрычніка каманда Спартака Пятровіча Мірановіча згуляе на турніры ў аўстрыйскім Інсбруку, дзе яе сапернікамі стануць зборныя Аўстрыі, Грэцыі і Фінляндыі.

З 27 па 29 снежня беларусы выступяць у Рызе. Мяркуемыя саперні́кі — каманды Латвіі, Украіны і Расіі. І, нарэшце, 11 і 12 студзеня, акурат напярэдадні чэмпіянату Еўропы, наша зборная згуляе два матчы ў гасцях з камандай Польшчы.

Арабскі прынц асеў у Мінску

Наследны прынц Дубаі шэйх Саід бен Мактум аль Мактум заняў толькі 2-е месца ў алімпійскай дысцыпліне "Скіт" на Адкрытым кубку Беларусі, які ў мінулыя выхадныя завяршыўся ў Мінску.

Прынц, які знаходзіцца ў Мінску ўжо каля тыдня, аказаўся на спаборніцтвах не хлопчыкам для біцця. Прызёр чэмпіянату Азіі расстраляў 144 са 150 мішэняў.

Дарэчы, у Мінску прынцу так спадабалася, што ён вырашыў застацца тут яшчэ на тыдзень, пасля чаго накіруецца на чарговыя спаборніцтвы ў Маскву.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ОЛИМПИАДА-2008

Мы за ценой не постоим!

До Олимпиады 2008 года в Пекине остается чуть менее года, но о премиальных деньгах спортсменам говорят уже сейчас. И хотя олимпийский принцип "Главное не победа, а участие" жив и сейчас, призовые за медали — тоже далеко не последний фактор. Если не один из первых...

Можно сколько угодно говорить о чести, совести и патриотизме, но денежный вопрос, как бы мы это ни пытались завуалировать, всегда был и остается одним из наиважнейших для спортсменов.

И, как правило, когда спортивные страсти уже утихают, обычно вспыхивают эмоции на почве премиальных и иже с ними: там не доплатили, здесь дали поздно, кого-то из тренеров обделили и т.д. и т.п.

Но после Олимпиады в Пекине белорусским олимпийцам, думаю, грех будет жаловаться на премиальные. Как известно, осенью прошлого года был подписан документ, который закреплял размер премиальных за олимпийские медали для белорусских спортсменов и тренеров на Играх-2008, 2010 годов.

За "золото" премия выросла с 60 до 100 тысяч долларов, за "серебро" — с 30 до 50 тысяч, за "бронзу" — с 20 до 30 тысяч.

Кроме того, все призеры Олимпиады получат в Минске квартиры.

Но дальше — больше! На этой неделе стало известно, что китайская компания Xtep, специализирующаяся на производстве спортивной экипировки, заключила рекламный контракт с Национальным олимпийским комитетом Беларуси. Согласно контракту, китайская фирма не только обеспечит наших спортсменов экипировкой, но и выплатит свои призовые всем белорусским медалистам. Чемпионы получат по 10 тысяч долларов, серебряные призеры — по 5 тысяч, бронзовые — по 3 тысячи. Естественно, эти суммы олимпийцам дадут сверх того, что им выдаст белорусское правительство.

Одним словом, если бы шестикратный олимпийский чемпион по спортивной гимнастике 1992 года Виталий Щербо, получивший в свое время за россыпь медалей всего 21 тысячу долларов и 8 тысяч швейцарских франков, повторил свой подвиг в Пекине, то получил бы он ни много ни мало, а 660 тысяч долларов и плюс квартиру.

Впрочем, такими, как Щербо, рождаются не каждый день. Например, общая сумма премиальных, заработанная белорусскими олимпийцами-медалистами на Олимпиаде 2004 года в Афинах, составила 480 тысяч долларов (в 2002 году в Сиднее — 667,5 тысячи).

Так что есть к чему стремиться и в плане спортивных достижений, и в плане материального благополучия.

Алесь СИВЫЙ.

КСТАТИ

Три года назад в Афинах белорусы завоевали на Олимпиаде 15 из 929 медалей, или 1,6 процента их общего количества.

Среди стран Европы в неофициальном зачете по золотым наградам Беларусь была 15-й.

На счету нашей сборной было 15 медалей — 2 золотые, 6 серебряных и 7 бронзовых.

15 медалей составили 60 процентов от плана, установленного до Игр нашим олимпийцам.

На Олимпиаде в Пекине планируется выступить не хуже, чем на Играх в Сиднее, где белорусская сборная завоевала 17 медалей.

ПРОФЕССИОНАЛЬНЫЙ БОКС



Если Сергей Ляхович не идет к горе…

…то человек-гора, боксер-супертяжеловес Николай Валуев сам решил прийти к Сергею Ляховичу и вызвать его на бой.

Состоится или не состоится матч — другой вопрос. Но в конце прошлой недели менеджер российского "супертяжа" **Борис Димитров** заявил, что следующим соперником его подопечного скорее всего станет белорус **Сергей Ляхович** по прозвищу Белый Волк.

"Мы достигли предварительной договоренности с представителями Ляховича, — сказал Димитров. — *29 сентября Валуев встретится с франкоканадцем Бержероном, а поединок с белорусом намечен на конец года. Победив Ляховича, которого, кстати, патронирует Дон Кинг, Коля станет обязательным претендентом на бой с чемпионом мира Русланом Чагаевым. И тогда узбекский боксер уже никак не избежит матча-реванша с Валуевым".*

Чуть ранее сообщалось, что в связи с болезнью чемпиона WBA в супертяжелом весе **Руслана Чагаева** руководство этой организации приняло решение организовать турнир среди четырех супертяжеловесов, занимающих наивысшие места в рейтинге WBA. Участниками предполагаемого турнира назывались экс-чемпионы мира **Николай Валуев, Сергей Ляхович, Джон Руиз и Тарас Биденко.** Победитель турнира и должен был встретиться с Чагаевым после его выздоровления.

Напомним, что белорусский экс-чемпион мира по версии WBO не выходил на ринг около десяти месяцев после того, как в ноябре 2006 года уступил титул чемпиона мира американцу Бриггсу. В штабе белорусского боксера заверяют, что Сергей уже оправился от травм и готов "сворачивать горы".

Вот и "гора" наметилась...

Алесь СВЕТЛАНИЧ.

Пад гукі каралеўскага аргана

"Кароль — ён і ў Віцебску кароль", — гаварылі музыканты пасля першага ў гісторыі Віцебска публічнага канцэрта арганнай музыкі, што адбыўся ў абласной філармоніі, дзе сёлета ўпершыню быў усталяваны канцэртны арган, або, як яго называюць музыкі, *"кароль інструментаў"*. Набыццё аргана абышлося бюджэту вобласці ў 800 тысяч еўра. Выраблены ён у германскім горадзе Овінгем, на фірме "Глатэр-Гётц", інструменты якой усталяваны ў Маскоўскім музычным доме і Пермскай філармоніі.

Перад канцэртам узяў слова выканаўчы дырэктар фірмы Штэфан Штурцар.

— Гэта першы наш арган для Беларусі, — сказаў ён. — Інструмент незвычайны тым, што размешчаны ў двух сектарах сцэны. Такія арганы сустракаюцца ў Еўропе, але зрэдку. Паводле музычных стандартаў, гэта сярэдні арган. Ён складаецца з 3 тысяч труб, самая вялікая з якіх — 7,5 метра, а найменшая — 1 сантыметр. Нам спатрэбілася паўтара года, каб вырабіць арган, — працягваў гер Штурцар, — а затым яшчэ больш за месяц пайшло на настройку інструмента.

Варта дадаць, што канструкцыя аргана падключана да магутнага камп'ютэра, здольнага запомніць больш як 40 тысяч камбінацый рэгістраў.

Пульт арганіста складаецца з дзвюх клавіятур, на кожнай — па 58 клавіш. Плюс яшчэ 30 клавіш для ног музыканта.

Высокую якасць незвычайнага па канструкцыі "караля музыкі" на канцэрце-прэзентацыі змаглі ацаніць выканаўцы — народны артыст Беларусі Ігар Алоўнікаў і выкладчык кафедры клавесіна і аргана Санкт-Пецярбургскай кансерваторыі Юрый Сямёнаў, які пагадзіўся стаць штатным арганістам Віцебскай філармоніі.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

І ў верасні будзеце з «Народнай воляй»!

Не кожны наш чытач змог зрабіць **перадаплату** адразу за шэсць месяцаў. Надыходзіць час, калі многім трэба пералічыць грошы за **вераснёўскія** нумары. Не спазніцеся! Не палянуйцеся, даражэнькія, і ў бліжэйшыя дні наведайце любы філіял "Беларусбанка", а там, дзе іх няма, — любое паштовае аддзяленне.

Паўтараем: мінчане могуць апературыўна зрабіць **перадаплату** праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 206-63-93 ці 206-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашы валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць **перадаплату** за любы тэрмін. Не толькі за верасень, а можна і за два месяцы, і да канца года.

Нагадваем: сума **перадаплаты** за месяц ранейшая — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм. Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую **АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ,** узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары. Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для тых, хто рабіць гэта будзе ўпершыню, не вельмі прыемная рэч. Але што зробіш: каб своечасова атрымліваць газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

0402280179

ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка

Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749

УНН* 100961759

(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2007 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка

Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749

УНН* 100961759

(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2007 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ

Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов

Абонентская карточка

на номера газеты «Народная воля»
за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2007 года
(ненужное зачеркнуть)

*Заполняется отчетливо **печатными буквами** и **обязательно** отправляется в редакцию с **копией платежного документа***

фамилия

имя **отч.**

индекс почтового отделения

область

район

название населенного пункта

город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)

улица пр-т переулок *(нужное — подчеркнуть)*

дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

ВАКОЛ СПОРТУ

Зідану за адзін матч даюць 250 тысяч долараў

Былы капітан футбольнай зборнай Францыі Зінедзін Зідан даў папярэднюю згоду згуляць за аўстралійскі клуб "Сідней" у дабрачынным матчы супраць новай каманды Дэвіда Бекхэма "Лос-Анджэлес Гэлаксі". Сустрэча павінна адбыцца 27 лістапада 2007 года ў Аўстраліі.

За выступленне ў складзе "Сіднея" француз павінен атрымаць 250 тысяч долараў, якія будуць пералічаны на рахунак яго дабрачыннага фонду.

Французскі паўабаронца, які завяршыў кар'еру пасля чэмпіяната свету 2006 года, прапанаваў узяць удзел у матчы ў Сіднеі свайму былому партнёру па зборнай Францыі Фаб'ену Бартэзу. Галкіпер, які перамагаў на чэмпіянатах свету і Еўропы, таксама сышоў з вялікага футбола.

Павел Бурэ судзіцца з авіякампаніяй

Зорка сусветнага хакея Павел Бурэ збіраецца адсудзіць у авіякампаніі British Airways 20 мільёнаў расійскіх рублёў.

Скандал, пасля якога і з'явіўся судовы іск хакеіста, адбыўся яшчэ ў кастрычніку мінулага года. Тады хакеіста ў літаральным сэнсе выцягнулі з самалёта брытанскай авіякампаніі ў аэрапорце "Дамадзедава" без аніякіх тлумачэнняў. Па неафіцыйнай версіі авіяперавозчыка, Павел Бурэ хуліганіў у самалёце.

— Тыя прабачэнні, што мне затым прынеслі, мяне не задаволілі, — заявіў Павел. — Не заставалася нічога іншага, як падаць іск у адзін з раённых судоў Масквы аб кампенсацыі нанесенага мне ўрону ў памеры 20 мільёнаў расійскіх рублёў.

Алесь ЖУКАЎ.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info
Індэкс 63222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.
Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 15.08.2007 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №